Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

СЬЦЯГ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 6 Вільня, Субота 21-га ліпня 1928 г. Год 1

Пасылайце дзяцей у родныя гімназіі.

Да бацькоў, якім трэба вучыць дзяцей, і наагул да ўсіх грамадзян, каму нашая бяда ня чужая бяда, робім мы гэты заклік. Не пазбаўляйце дзяцей магчымасьці, пакуль ня позна, здабыць у роднай гімназіі, на роднай мове сярэднюю, а там і вышэйшую асьвету. Гэта патрэбна для шчасьця вашых дзяцей, на радасьць і падтрыманьне вас самых, гэта патрэбна для адраджэньня нашага народу, для ўваскрашэньня яго з векавечнае няволі-нядолі. Толькі праз асьвету чалавек знаходзіць для сябе шырокі, верны і добры шлях жыцьця, толькі шырака і навукова ўзгадаваныя людзі могуць зьявіцца запраўднымі павадырамі і абаронцамі народнымі і будаўнічымі лепшае долі свае Бацькаўшчыны.

Чаму, ня гледзячы на тысячагадовую гісторыю, народ наш дасюль сваім удзелам мае толькі цемру, нэндзу ды пакуту, у той час, як іншыя славянскія народы, яго равесьнікі, даўно выйшлі на шлях самастойнага дзяржаўнага жыцьця і дабіліся свайго месца ў сям'і народаў?— Толькі таму, што народу нашаму, цёмнаму, прыгнечанаму, паняволенаму заўсёды бракавала асьветы, бракавала школаў, гімназіяў, акадэміяў, унівэрсытэтаў, бракавала шырока адукаваных, інтэлігентных людзей, якія-б са ўсёю сьвядомасьцяй і нацыянальным пачуцьцём працавалі над духовым, нацыянальным, сацыяльным і эканамічным адраджэньнем свайго народу, ад якіх, усё болей і болей пашыраючыся і разрастаючыся, пайшоў-бы з пакаленьня ў пакаленьня цэлы круг культурных, у праўдзівым значаньні гэтага слова, людзей, шчыра адданых свайму народу, сваёй культурнай працы, сваім нацыянальным і сацыяльным ідэалам.

І так будзе заўсёды, пакуль народ не прачнецца, і пакуль не зразумее, што іншага шляху для свайго вызваленьня, як толькі шлях асьветы—няма. Мы не гаворым аб пачаткавай грамаце, аб пачатковых школах, аб „лемантару". Дзяды ды прадзеды нашыя ўмелі чытаць мо' ня гарэй нас. Ня ў тым справа. Тут ідзе аб тым, каб увесь народ зразумеў, што ня знойдзе ён сваей долі без асьветы, бяз шырака разьвернутае культурнае працы, без інтэлігентных і сьвядомых людзей, і ня толькі зразумеў, але дзейна і сьвядома далучыўся да тых, хто працуе на полі асьветным, хто кліча да асьветы, як мы тут — далучыўся сваёю працаю, сваім падтрыманьнем, сваім прыкладам.

Мы кажам: *настаў час, калі трэба стварыць масавае, стыхійнае імкненьне народу да асьветы ў шырокім значаньні гэтага слова.* Мала пасылаць адзінкі, хоць і болей-меней здольныя і падгатаваныя. Трэба кінуць у гімназіі як мага болей дзяцей, кінуць з кожнае вёскі, з кожнага самага глухога і забытага кутка нашае старонкі, кінуць не ў адзіным толькі бліжэйшым школьным годзе, а кідаць кожны год, паступова, рэгулярна, кідаць у гімназіі цэлымі соткамі і тысячамі дзяцей. Ня хопіць у іх месца—адчыняць новыя гімназіі, новыя школы земляробныя, прафэсіяльныя і іншыя. Цэлую сетку іх трэба стварыць, каб кожны беларускі хлапец і дзяўчына, не пакрыўджаныя здароўем і здольнасьцямі, пры большым ці меншым падтрыманьні з боку сям'і, беларускіх установ і наагул ўсяго грамадзянства, мог знайсьці сабе дарогу і выйсьці на культурнага і багатага ведай і досьледам беларускага дзеяча.

У гэтай балючай справе нашай ніхто ня можа застацца раўнадушным. Трэба ўсім і кожнаму, наагул усяму грамадзянству падняць на мясцох плянамерную і сталую акцыю, трэба ўсім да аднаго выйсьці на фронт змаганьня за сярэднюю і вышэйшую асьвету, як усе год—два таму назад выйшлі на фронт змаганьня за пачаткавую белар. школу,— змаганьня, якое, навет у нашых варунках, дало ўсё-ж такі нейкі плод. Практычна вось некаторыя парады, як і што рабіць: адчыняйце пачаткавыя школы, шукайце вучыцялёў, якія-бы падгатаўлялі дзяцей у гімназію, пашырайце кніжкі, навуковую літэратуру, адчыняйце бібліятэкі, зьбірайце грошы на стыпэндыі для незаможных вучняў, для пашырэньня сеткі беларускіх гімназій, дабівайцеся ад гмінных рад грашовых дапамогаў для сваіх кандыдатаў у гімназіі, ладзьце спэктаклі, лекцыі, вечарыны, рабіце вулічныя зборкі на культурна-асьветныя мэты і г. д.

Тое, што ў мінулым школьным годзе Віленская і Навагрудзкая Беларускія Гімназіі выпусьцілі першых дзесяць матурыстаў, якія маюць права (папярэднія выпускі гімназіі гэтага права ня мелі) да паступленьня *без экзамену да ўнівэрсытэту і іншых вышэйшых польскіх школаў,* павінна толькі прыдаць болей энэргіі, як вучням, каб пасілілі свае навуковыя заняткі, сваю веду, так і бацьком і ўсяму грамадзянству, каб давясьці да навучаньня ў гімназіях, як мага, болей дзяцей і памагчы ім там дапяць сваей мэты.

Абвестка.

Гэтым Беларускае Навуковае Таварыства абвяшчае, што яно супольна з Таварыствам Беларускае Школы і Выдавецкім Таварыствам арганізуе выстаўку Беларускага хатняга промыслу, культуры і мастацтва пры І паўночным кірмашу ў Вільні, які адбудзецца паміж 18 жніўня і 12 верасьня 1928 г.

Вышпамяненая Выстаўка адбудзецца ў памяшчэньні Галоўнае Управы Таварыства Беларускае Школы (вул. Сьв. Анны 2), якое згодна з пастановай Выканаўчага Камітэту выстаўкі ўключана ў агульную плошчу выстаўкі.

Выстаўка Беларускага хатняга промыслу, культуры і мастацтва мае вялікае эканамічна-культурнае значэньне і дзеля гэтага Навуковае Таварыства зварочваецца да ўсіх грамадзкіх арганізацыяў, а таксама і прыватных асобаў, якія маюць адпаведныя экспонаты, з заклікам прыняць удзел у выстаўцы.

З усялякімі пытаньнямі ды інфармацыямі зварочвацца да Камітэту Беларускага Навуковага Т-ва па арганізацыі выстаўкі па адрасу **Вільня, вул. Сьв. Ганны 2.**

Беларускае Навуковае Т-ва.

(Глядзі анкетны ліст і заклік на 3 стар.).

Ня менш цікаўнае, што другой на чарзе пасьля Нямеччыны дзяржавай, раней усіх іншых адбудаваўшых сваю валюту, як сьцьвярджае Л.-Дж., зьяўляецца СССР. Такім чынам гэты, адзін з выдатнейшых сусьветных фінансістаў цяпер пацьвярджае, як факт, тое яшчэ, што ў 1920 г. пацьвярдзіў другі слаўны англійскі фінансіст праф. Кэйнс, прадсказаўшы, што „Радавая Расея першая адбудуе сваю валюту"... Толькі за год, пасьля Нямеччыны, Швэцыі і СССР, пачынаюць працу над адбудовай валюты — Брытанская Імпэрыя, Галяндыя, Вэнгрыя, Фінляндыя, і Швайцарыя. У 1926 г. стабілізуе сваю валюту Бэльгія; у 1927 г.—Італія, Данія і Польшча; у бягучым годзе часткова распачалі, часткова даканалі стабілізацыю — Грэцыя, Нарвэгія і Францыя. Ня трэба толькі думаць, што ўсе гэтыя краі ўсталілі сваю валюту паводле даваеннага роўня: не, — у значнай частцы іх ровень гэты спаў, часам і вельмі значна. Мы ведаем, што швайцарскі франк стаіць ужо на роўні залатога, тады як францускі — толькі пятая частка свайго залатога „парытэту". Новы „другі" польскі злоты— варты крыху больш паловы першага. Італьянская ліра, да вайны роўная залатому франку, цяпер у 4 разы менш вартая, аднакжа, як мы ведаем, вышэй стаіць, як францускі франк.

Толькі 4 дзяржавы ў Эўропе адбудавалі сваю валюту цалкам да даваеннай роўні, гэта—Англія, Нямеччына, Гішпанія і Швайцарыя. Такім чынам у Эўропе яшчэ ў вельмі значнай меры пануе пераходнае палажэньне „валютнай пярэстальці", якая вельмі шкодзіць нармальнаму ходу і разьвіцьцю міжнародавага абмену. Льлёйд-Джордж лічыць стабілізацыю францускай валюты фактам вялізарнага значэньня,—як ува ўнутраным жыцьці Францыі, таксама і ў агульнай сусьветнай гаспадарцы. Дзіва, што Льлёйд-Джордж цешыцца гэтай стабілізацыяй. Спадак францускай валюты даў магчымасьць францускай прамысловасьці пабіць англійскую навет у самай Англіі, як да вайны — англійская біла францускую. Калі да вайны англійскі вываз у Францыю быў у паўтара разы больш, як францускі ў Англію, дык цяпер лічбы — якраз адваротныя. Але цяпер—пасьля легальнай стабілізацыі францускай валюты, цэны ў краі пачнуць аблічацца ў золаце, кошты прадукцыі падскочаць угару, раўнуючыся па сьветавым цэнам. — Усе гэта павінна выклікаць гаспадарчы крызіс у Францыі, з якога аднак-жа кажа, аўтар, Францыя выйдзе ўзмоцненай (?!). Так пацяшае аўтар Францыю. „Стабілізацыя валютаў наагул для прамысловага жыцьця Эўропы—запраўднае дабрадзейства. Ад Атлянтыцкага акіяну аж да Уралу — з выняткам польскай граўніны (?) і італьянскай паўвыспы—ўсе прамысловыя краі моцна зьвязаліся цяпер золатам", кажа аўтар.

Гэтая адбудаваная ізноў непераможная „залатая сувязь" паміж краямі асабліва карысна адаб'ецца на супрацоўніцтве эмісыйных (выпускаючых забясьпечаныя папяровыя грошы) банкаў усіх дзяржаваў сьвету. Яна-ж, гэта „залатая сувязь", здолее перамагчы ўсе тыя перашкоды ды бар'еры для сусьветнага гаспадарчага абмену, якія нарабілі розныя паваенныя слабыя гаспадарча і палітычна дзяржавы з дрэннымі валютамі—для абароны сваей „незалежнасьці". Стабілізацыя францускай валюты, канчае аўтар, дасьць магчымасьць і канчальнага ўрэгуляваньня справы ваенных даўгоў і адшкадаваньняў, якая становіцца рашуча на чаргу дня.

Льлёйд-Джордж аб адбудаваньні валюты у Эўропе.

У зьвязку з стабілізацыяй францускага франка зьмясьціў цікаўны артыкул былы дыктатар Англіі Льлёйд-Джордж, спэцыяліст па фінансавых справах, як былы ў свой час „рэвалюцыйны" мін. скарбу ў цэлым сьцягу габінэтаў Англіі. (Гл. „Kur. Warsz". 9 VII).

Льлёйд-Джордж сьцьвярджае, што Францыя, да вайны амаль не багацейшая дзяржава ў сьвеце, пасьля вайны — адна з апошніх устабілізавала сваю валюту, дый то — ў пяць разоў ніжэй даваеннай яе роўні...

Л.-Дж. прыводзіць вельмі цікаўны сьцяг краёў — у чарговым парадку адбудаваньня імі сваей валюты. На першым месцы ў першым радзе стаіць... Нямеччына,—якраз быццам найбольш пабітая ў вайне... ужо ў 1924 г. — пасьля заваротнага спадку валюты, абясцэнянай амаль да 0 (інфляцыяй) — Нямеччына з ня менш заваротнай шпаркасьцяй адбудоўвае цалкам — у даваенным парытэце (роўні) — сваю залатую марку. Трэба тутака дадаць, што пэрыяд інфляцыі, які папросту з'еў дарэшты ўсе прыватныя і скарбовыя капіталы ў Польшчы, у Нямеччыне быў выкарыстаны ўрадам і самаўрадамі так, што ўся творчая сіла нацыянальнага капіталу была зрэалізавана на разбудову роўнага роду агульна патрэбных рэчаў, як шляхі, чыгункі, вагзалы, фабрыкі, заводы, рэгуляцыя рэкаў, мэліорацыя грунтаў і т. п. Такім чынам амаль ня ўсе капіталы, быўшыя ў краі ды створаныя ў часе інфляцыі таннай працай, — у значнай меры асталіся — у іншай форме — у краі. Таму — калі прыйшоў час — калі спроба францускага ўраду задушыць Нямеччыну была ўрэшце спынена супольным адпорам Нямеччыны, Амэрыкі і Англіі, — Нямеччына здолела шпаркім ходам адбудаваць сваю валюту, сьпярша пад відам часовай „рэнтавай маркі"—выпушчанай пад заклад гэтага свайго нацыянальнага капіталу, а пасьля — з дапамогай вялізарных амэрыканскіх пазыкаў — вярнуўшыся да залатой даваеннай валюты.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

Апошняе слова падсуднага Астроўскага.

Высокі Суд! Апошняе сваё слова я выкарыстаю выключна для апраставаньня некаторых пытаньняў, парушаных пракурорам Раўзэ ў яго прамове і рэпліцы.

Перш-на-перш — гэта будзе датычыць так-званага зьезду ЦККПЗБ, які быццам меў адбыцца ў маёй кватэры ці ў памяшчэньні Віленскай Беларускай Гімназіі ў сьнежні 1924 г. Пан пракурор Раўзэ сказаў, што ані я, ані мая абарона на гэтае пытаньне не адказалі.

Так, але ці можна наагул адказаць на так пастаўленае пытаньне? Дзе ж урэшце адбыўся гэты зьезд? Чаму пракурор не паклапаціўся прынамсі вызначыць яму месца? А з тых дакумэнтаў, якія ёсьць у справе, мы ведаем наступнае:

1) Сьведка Васілеўскі — асьпір. палітычнай паліцыі, кажа, што ён адбыўся ў кватэры Астроўскага, але мяне самога на тым зьезьдзе ня было; 2) Сьведка Ясінскі, камісар паліцыі Беластоцкага Ваяводзтва, паказвае (а гэта ёсьць у томе VI.D. старонка 12) што паводле паказаньня нейкага Богдана vel Грэка, якое ён даў „шподовніку" Бельскае паліцыі Скірмунту, зьезд гэты адбыўся ў беларускай сэмінарыі ў Вільні. Дык пашукаем-жа таго, што сказаў аб гэтым сам Скірмунт. Нажаль у актах, якія суд мае, гэтага знайсьці нельга, бо сам Скірмунт аб гэтым нічога не гавора. А можа сказаў аб гэтым нешта Гурын? А Гурын, як цьвердзіць пракурор Раўзэ, да студзеня 1925 году быў галоўным гэрштам КПЗБ, галоўным гэрштам таго „Вялікага Майстра", аб якім тут так многа казаў пракурор Раўзэ, дык хіба-ж такі зьезд ня мог адбыцца бяз удзелу Гурына? Дакумэнты, аднак, зноў-жа нам сцьвердзяць, што і Гурын аб гэтым зьезьдзе нідзе нічога не гаворыць. Дык, паны Судзьдзі, самі падумайце, ці можна даць адказ на так сфармуляваныя і так разьбежныя пытаньні?

Урэшце калі-б нат' згадзіцца з тым, што гаворыць сьведка Васілеўскі, дык паглядзім, ці магчыма гэта з пункту гледжаньня чыста тэхнічнага? Паны Судзьдзі, Устава Карнага Судаводзтва, калі ня мыляюся, дае Вам права ў прыпадку сумліву, у прыпадку заблутанасьці ды супярэчнасьці паказаньняў сьведкаў выяжджаць на месца праступленьня. Дык вось, я Вас ветліва прашу паехаць на Вастрабрамскую 9 і паглядзець тое памяшчэньне, аб якім тут Вам гаварыў сьведка Васілеўскі. Я заяўляю, што дзеля таго, каб трапіць у кватэру Дырэктара Віленскай Беларускай Гімназіі, трэба прайсьці праз калідор гімназіі, на каторы выходзіць тры клясы, а ў гэтых клясах заўсёды ёсьць вучні, бо тут, або адбываюцца нармальныя школьныя лекцыі, або дзеці з інтэрнату прыгатаўляюцца да лекцыяў наступнага дня. Апрача

таго,—на калідоры бязупынна дзяжураць вучні, якія спаўняюць абавязкі старажоў (бо трэба ведаць, што Беларускія Гімназіі ў Польшчы ня могуць пазволіць сабе на такую роскаш, як сторож), а за гэта 4 вучністаражы маюць бясплатнае ўтрыманьне ў інтэрнаце.

Каб трапіць у кватэру дырэктара з школьнага калідору, трэба таксама прайсьці яшчэ і праз канцэлярыю гімназіі. Іншага ўваходу ці выхаду няма. Скажу болей: нельга ўлезьці ў кватэру дырэктара на'т і праз вакно, бо вокны закратаваны. Дык цяпер падумайце, паны судзьдзі, ці пры такіх абставінах можна даць веры таму, што плявузгаюць гэтыя пракурорскія сьведкі? Ці-ж магчыма дапусьціць, каб камуніст, рыхтуючы — такую канcьпірацыйную нараду, рабіў гэта на вачох 60 дзяцей з інтэрнату? Адно з двух: або я ня маю глуздаў, дык тады ня трэба мяне трымаць тут на лаве падсудных, а адправіць у дом вар'ятаў, або бязглуздыя тыя, хто гэткія рэчы гаворыць.

Наступна з прамовы пракурора Раўзэ вычувалася, што ён вельмі не здаволены з таго, што я падчас судовае расправы адмовіўся адказаць на яго пытаньне. Так, я скарыстаў з прыслугоўваючага мне па закону права зусім сьвядома. Можа адказ мой быў зроблены ў грубой не каррэктнай форме? Магчыма, але інакш я паступіць ня мог. Вы памятаеце, паны Судзьдзі, што я падчас суду даваў самыя падрабязныя адказы на ўсе пытаньні, якія ставіліся мне ня толькі Вамі, але і пракурорам Калапскім. Пракурору Раўзэ я адмовіўся адказаць таму, што ўсе пытаньні, якія задаваліся нам пракурорам Раўзэ, задаваліся ня ў мэтах высьненьня праўды, а выключна ў мэце зьдзеку ды зьнявагі над безбароннымі людзьмі. А што гэта было так, зараз давяду дукумэнтальна. Пракурор Раўзэ задаваў пытаньне для высьвеньня быццам маіх палітычных поглядаў у 1917 годзе ў той час, калі нас судзяць згодна з актам абвінавачаньня за час ад паловы 1925 году. Далей, пракурору Раўзэ хацелася нейк мацней зьвязаць мяне з дзейнасьцю Цэнтральнага Сэкрэтарыяту Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Але нашто-ж тады ламацца ў адчыненыя дзьверы? У актах справы (том VI F) ёсьць маё ўласнаручна-падпісанае паказаньне з дня 14 лістанада 1927 г., дзе між іншым даслоўна сказана так: „...гаворачы аб тым, што я ня прыймаю чыннага ўдзелу ня толькі ў працы Грамады, але і наагул у ніякай палітычнай арганізацыі, раблю гэта выключна дзеля таго, што лічу сваім абавязкам паказваць праўду. Ня хочучы, аднак, каб судовыя ўлады зразумелі гэта так, што быццам я выракаюся Грамады, як нейкай „wywrotowej“ арганізацыі з баязьні перад адказнасьцю, высьняю: і далей прыведзены мой пагляд на Грамаду, як на зусім легальную арганізацыю шырокіх беларускіх масаў, якая шчыра бароніць інтарэсы працоўных. Я ня буду чытаць усяго майго паказаньня, бо гэта забрала-б шмат часу, тым больш што суд яго мае ў актах справы, а прачытаю толькі яшчэ кароценькі абзац: „...калі-б абставіны вымагалі ад мяне неабходнага належаньня да якое-небудзь палітычнае арганізацыі, дык бязумоўна, не зважаючы на'т на пэўныя разьбежнасьці, якія заходзяць паміж маім ідэолёгічным поглядам і праграмаю Грамады, з усіх існуючых беларускіх арганізацыяў выбраў-бы Грамаду“.

Гэта хіба служыць найлепшым доказам таго, што я не выракаюся Грамады і супрацоўнічаў з ёю ў галіне культурна-эканамічнай. Грамада паМоймУ ня партыя, а арганізацыя шырокіх масаў беларускага працоўнага народу. І калі тут казалі, што кожную арганізацыю характэрызуе не праграма, а тактыка, дык я пайду яшчэ далей і скажу: не праграма і ня тактыка, а людзі. Галоўных арганізатараў і тварцоў Грамады я знаў, а старшыня яе Тарашкевіч — гэта мой таварыш і найбольшы прыяцель і я з імі салідарызуюся.

Не магу памінуць яшчэ аднаго пытаньня, якае закрануў пракурор Раўзэ — гэта справы Мэртэнса. Пракурор нам робіць закід, што калі мы хочам нешта даказваць аб Гурыне, дык павінны былі-б паклікаць Мэртэнса за сьведку. Высокі суд, сапраўды для мяне не зразумела як-бы гэта выглядала? Нас абвінавачваюць у камунізьме, а мы паклікалі-б на сьведку чалавека, які пракурорам кваліфікуецца, як камуніст. Тады-б слушна было адказаць нам аднэю польскаю прыказкаю: „Masz, cyganie, świadków? — Mam żonę i dziatki“. Я зрабіў тут якраз тое, што магло-б сапраўды высьветліць праўду, бо я дамагаўся ад сьледчага судзьдзі Паўлюця „dokonać“ oględzin akt sprawy Metersena — мне хадзіла не аб паказаньні Мэртэнса, а аб паказаньні Гурына ў той, справе. Я пераконаны, што там і тады Гурын паказваў зусім іначай. Сьведка Ясінскі нам тут выразна сказаў, што Гурын у 1925годзе, калі Ясінскі бадаў яго амаль ня ў працягу 3 месяцаў, адмовіўся назваць якое-небудзь прозьвішча. Я пераконаны, што ўсё тое, што Гурын паказаў у гэтай справе гэта „твор“ шмат пазьнейшы, зроблены па загаду нейкага, мо' ўжо не „вялікага“, як казаў пракурор, а „чорнага Майстра“. Нажаль судзьдзя Паўлюць адмовіў мне і дзіўныя матывы ягонае адмовы Вы знойдзеце, Паны Судзьдзі, у актах сьледзтва гэтае справы. Так праводзілася пракуратурай сьледзтва ў справе Грамады.

На заканчэньне яшчэ скажу пару слоў аб Банку. Я разумею, Паны Судзьдзі, што гэтая справа ўжо Вас ня цікавіць, яна Вам збрыдла ды й нам згоркла, але міма яе я прайсьці не магу. Не магу таму, што, калі пракурор Раўзэ здавалася-б павінен быў зразумець урэшце ўсю недарэчнасьць ягоных аблічэньняў і прызнацца ў гэтым перад Судом, ён у рэпліцы лічыў магчымым яшчэ тлумачыцца тым, што быццам у банкавых кнігах няма сальда на 1-га студзеня 1926 г. Заяўляю публічна, што пракурор Раўзэ сказаў сьвядома ня праўду. Сальдо ёсьць, бо ёсьць касавая кніга і Вы, Паны Судзьдзі, хіба добра гэта памятаеце. Далей, робячы свае знамянітыя аблічэньні, каб атрымаць гэтую легендарную суму 15.000 даляраў, пракурор Раўзэ дадаў суму, якая знаходзілася на рахунку аддзелаў і тлумачыцца тым, што ён ня ведае, ці гэта сумы прыватных асобаў, ці гэта сумы аддзелаў. А ці-ж ад гэтага справа мяняецца? Ці-ж калі на'т гэта сумы аддзелаў, дык яны не ўваходзяць у суму Цэнтралі? А ці пракурор Раўзэ забыўся, як ён сам дамагаўся, каб у Суд былі прадстаўлены кнігі Пінскага аддзелу? А ці Цэнтраля ўперад не пасылала неабходныя аддзелам сумы? А калі яны гэтыя сумы зварочваюць у Цэнтралю, дык гэта ўжо нейкія іншыя сумы?

Урэшце з кніг ясна відаць, што гэта сумы прыватных асобаў, толькі чамусьці пракурор Раўзэ адзін гэтага ведаць ня хоча. Я педагог і ведаю, як шкодна даваць вучням падчас пісьменнае працы з арытмэтыкі адказ задачы, бо тады звычайна вучань, няўмеючы рашыць задачу, проста падтасоўвае, падганяе свае абліченьні пад адказ. Так было і тут. Пракурору Раўзэ трэба было падаганяць свае абліченьні пад адказ 15.000 даляраў. Але-ж гэтая задача мае і другі адказ—30.000 даляраў, а аб гэтым гавора нам сьведка Васілеўскі ў томе VI-F на старонцы 5. Ці думаеце, Паны Судзьдзі, што нельга пры помачы надобнае бугальтэрыі атрымаць і гэты адказ? О, можна!—і я гэта зараз зраблю: калі да тае сумы, якую атрымаў пракурор Раўзэ (яна толькі будзе выносіць ня 15.000 даляраў як тут казаў пракурор „co do feniga“, а 15.269 даляраў) калі дадаць сюды яшчэ 11.750 даляраў, якія атрыманы пераказамі з Рыскага Транзітнага Банку, а іх-жа лічылі грашыма „вялікага майстра“, ды сальдо на 1-га студзеня 1927 г. і сальдо ў дзень нашага арышту, што выносе прыблізна 2.930 даляраў. дык акурат атрымаем 30 000 дал. (толькі без 1 дал.). Вось да чаго можна дайсьці пры помачы такое бугальтэрыі.

Пракурор загневаўся калі нехта з абароны назваў такую бугальтэрыю „дзяцінаю“. Слушна, гэта бугальтэрыя ня дзіцячая. О, далёка не, бо дзіцячая бугальтэрыя была-бы чыстаю, нявіннаю, наіўнаю... Гэта бугальтэрыя ня дзіцячая, а бугальтэрыя... (Тут старшыня Суда папераджае прамоўцу каб ня ўжываў абразлівага тэрміну). Астроўскі—Не, пане Старшыня, будзьце спакойны, я добра памятаю, што прамаўлаю з лавы падсудных, я з рамак законных ня выйду. Гэта, Высокі Суд, называецца бугальтэрыяй.. пракурорскай. І вось на падставе такое бугальтэрыі пракурор Раўзэ робіць нам найагіднейшы закід, закід здрады.

Пракурор Раўзэ фактычна нас не абвінавачвае, бо-ж на гэта ў справе няма абсалютна ніякіх падставаў, аднак, не зважаючы на гэта, пракурор Раўзэ абкідаў цэлы час нас гразёю, выліваў на нашы галавы цэбры памыяў, бясчэсьціў, аплёўваў..., але відаць і гэтага было яму яшчэ мала, дык ён пасягнуў на чэсьць нашых сем'яў, на чэсьць нашых дзяцей...

Пракурор Раўзэ сказаў, што грошы, якія ўмешчаны на рахунках мае жонкі і дачкі, гэта крывавыя чырвонцы ягонага „вялікага майстра“. Дзе падставы для такое зьнявагі, дзе доказы? Іх у справе няма. Хто даў права пракурору абкідаць гразёю нявінных людзей? Можа вам, Паны Судзьдзі, пракурор дасьць адказ на гэтае пытаньне.

Школьная працоуня прыроды і Віленская Белар. Гімназія.

Яшчэ ў 1921 годзе стараньнем былага вучыцеля Першае Віленскае Белар. Гімназіі А. Дмахоўскага ў Вільні, на Завальнай вул. 5, быў закладзены музэй прыроры пад назовам: Школьная Працоўня Прыроды (Szkolna Pracownia Przyrodnicza).

Галоўнай мэтай гэтай вельмі цікавай і неабходнай у школьным жыцьці ўстановы было дапамагчы ўсім школам, як урадовым, так і прыватным (пачатковым і сярэднім) у сыстэматычным праходжаньні курсу прыроды лябараторным шляхам, г. зн., шляхам, абапертым на ўласным досьледзе і самастойнай працы вучня.

За пяць гадоў свайго існаваньня шк. працоўня сабрала ў сабе амаль ня ўсе навуковыя дапамогі і прылады, якія неабходны для праходжаньня курсу прыроды ня толькі ў пачаткавых школах, але і ў сярэдніх.

У сучасны момэнт школьная працоўня прыроды займае два будынкі.

У адным будынку сабраны ўсе прылады, прэпараты і навуковыя дапамогі, неабходныя для праходжаньня курсу няжывой прыроды: фізыкі, хіміі, мінэралёгіі, геолёгіі і тэхнолёгіі.

Асобнай увагі заслугоўвае тут той факт, што прылады, якія знаходзяцца ў гэтым корпусе, вельмі простай канструкцыі і пабудованы ў уласнай майстроўні, якая знаходзіцца пры працоўні.

Шмат якія з гэтых прыладаў, мне здаецца, удалося-б пабудаваць кожнай беларускай школе на лекцыях ручной працы, пры вельмі нязначных матэрыяльных затратах, што асабліва трэба прыняць пад увагу нашым правінцыяльным школам. У другім будынку школьнай працоўні сабраны матэрыял, датычачы курсу живой прыроды — зоолёгіі і батанікі.

Тут, безумоўна, на першым месьцы трэба паставіць багатую калекцыю марскіх жывёлаў з Адрыятыцкага мора, а таксама ня менш цікавую і багатую калекцыю чучалаў, зьвяроў і птушак, як нашых краін, так і цёплых старонак.

Большасьць чучал (асабліва мяйсцовых жывёлаў) зроблена таксама на мейсцы, а ня выпісвана па дарагой цане з заграніцы.

Тут-жа знаходзяцца акварыумы і тэррарыумы. У першых гадуюцца нашы рыбы, вадзяныя расьціны і жывёлы; у другіх—гады, жабы, матылі і інш.

Пры школьнай працоўні маюцца два батанічных гароды.

У адным з іх сабраны лякарскія расьціны, якія дзіка растуць у нас на Беларусі, а ў другім тыя дрэвы, кусты і расьціны, якія параскіданы па ўсім абшары нашае бацькаўшчыны, а тут сыстэматызаваны і падзелены на расьціны водныя, балотныя, карысныя, шкодныя і г. д.

Ёсьць тут і расьціны чужаземныя: рыс, ватнік (хлапчатнік), мімоза і др. Гэтыя расьціны гадуюцца ў асобных кватэрках з шкла.

У сучасны момэнт пры школьнай працоўні будуецца аранжэрэя (цяпліца) для расьцін цёплых старонак.

Так выглядае, праўда, у самым агульным зарысе, тое вялікае і неабходнае для кожнай школы багацьце, з якога, хоць і позна, бо аж на пятым годзе існаваньня школьнай працоўні, удалося, нарэшце, скарыстаць і Віленскай Беларускай Гімназіі.

У пачатку гэтага 1927/28 школьнага году вучыцель Віленскае Белар. Гімназіі гр. М. Пяткевіч па даручэньню Дырэкцыі Гімназіі зьвярнуўся да дырэктара школьнай працоўні гр. А. Дмахоўскага з просьбай, каб ён дазволіў выкарыстаць сваю працоўню для лекцый Гімназіі.

Дазвол быў дадзены, адначасна з дазволам былі вызначаны дзьве гадзіны ў тыдзень (чацьвер і субота ад 11—12 гадз.), у якія на працягу ўсяго школьнага году можна было прыхадзіць у школьную працоўню для лекцый па няжывой прыродзе, апрача гэтага, яшчэ была вызначана адна гадзіна (ў панядзелак) для працы па жывой прыродзе.

За гэты школьны год Віленская Белар. Гімназія змагла адрабіць у школьнай працоўні каля пяцёх-дзесяцёх лекцый з няжывой прыр., каля 20-х лекцый з прыроды жывой, апрача гэтага было зроблена да дзесяцёх экскурсіяў у батанічныя гароды, працоўні з мэтай шырокага азнаямленьня з самымі гародамі, а таксама і з тымі расьцінамі, якія павінны быць пройдзены, згодна з праграмай гімназіі.

Самая праца ў школьнай працоўні адбывалася так:

У вызначаную гадзіну кляса прыходзіла ў працоўню. Зараз-жа яе ўводзілі ў асобную салю і садзілі за даўгія сталы, на якіх стаялі групамі тыя прылады, якія неабходны былі для лекцыі. Прылады перад лекцыяй расстаўляла лябарантка-возная.

Вучні рассаджваліся групамі: па 3—4 чалавекі на кожны камплект прыладаў.

Азнаёміўшыся з назовам прыладаў і самымі прыладамі, а таксама з тым, што і як яны павінны рыбіць, вучні зараз-жа прыступлям да працы: важылі, мерылі, рысавалі, аднатоўвалі ў спытках галоўныя моманты з сваіх дасьледаў і г. д... Прысутны.

(Далей будзе).

МОЙ „ВЫВЯД“.

(Фэльетон).

Якую газэціну ня возьмеш, у кожнай зьмешчаны „вывяд“ то з „шэфам“, то з „прэзэсам“, то з „начэльнікам выдзялу“, ня вылучаючы канешна і „беспечэньства“—проста такі ўвайшлі ў моду гэты вывяды! Ня хочацца-ж, каб і наша часапісь заставалася, так сказаць, ад заходняе культуры; давай, думаю, зьлётаю і я да каторага!

Надумана—зроблена. Я, бачыце, чалавек пряткі, гарачы!

Схапіў пук паперы пад паху і папёр.— Трэба, думаю, было-б па добраму парадку— партфэль, але-ж скуль возьмеш? Прасіў на павер—не даюць!

— Ведаем, кажуць, мы вас, „шышоў“, гэтакія! Завастрыў агрызак алавіка і выскачыў на вуліцу. Народу — як вар варыцца! разадзетыя, лякеркі блішчаць, як, няраўнуючы, люстэрка! Глядзь я на свае камашы, ажна, што за немач, кожны дзень, думаю, лье дождж, а яны вышчараўшыся піць просяць! Агляну вопратку, праверыць знача ці ўсе ў парадку, бачу подшыўка на лакцёх стырчыць. Раздумаўся ідучы і павесіў нос. Дзе-ж тут соваццa да шэфаў! Ня пусьціць швайцар: падумае, чаго добра, што злодзей які! А страх хочацца і мне-ж так, як людзі! Пайду, думаю, хоць да свайго беларускага пасла, у яго лякаёў няма, ніхто ня выжане.

Увайшоў. Так і так, кажу, пан... сябра пасол, у справе... вось, „вывяд“ хацеў-бы зрабіць! Доўга ня гутарачы, згодзіўся пасол. Прысеў я скоранька на кончык століка, разлажыў свае прылады і слухаю ажна разьязвіўшыся—рады, што і я так, як людзі!

— Аб чым пачынаць? — пытаецца. Аб чым?! Гм... што небудзь такое... ну, напрыклад, што ў Сойме рабілі, як там тое, гэтае?

— А што-ж там, кажа, зробіш за гэтымі сьвіньнямі брухатымі, каб на іх дохля! Заікнешся аб амнустыі зьдзеках, школах, аб зямельцы для сялян, дык зараз „лайдакі“, „рабацтва“ праклятае, як заравуць! — У Расею!! Бальшавікі!! Далоў!—як загрымяць, каб на іх пярун грымеў!—

— А вы на іх?

— Прабавалі, дык загадаюць „возьным“, а тыя, каб ім рукі адсохлі, няньчаць, няраўнуючы, як чужых дзетак — вывалакуць на вуліцу і грымі там, на каго хочаш! Ох, каб на іх... ах каб ім...—

Як панес, браткі мае, як панес, ажна мае вушы звялі!

— Дзе вы такую адукацыю атрымалі, пазвольце запытаць? Гэтак жа, кажу, і п'яныя мужыкі ня лаюцца!

— Не твае—гыркнуў—дзела! Ня гэтак і ня гэтакія Багатыры як я лаюцца.—Пацалуй ў тое мейсца—падчас выпалiваюць, а мне, і бог і людзі даруюць!—

— А што гэта цяперача такая мода?— пытаю я.

— Ня мода-паясьняе—а, бачыце, кожная старонка стараецца „праславіцца“, здаўсць, так сказаць, папулярнасьць: французы—модамі, італьянцы фашызмам, амэрыканцы—пазыкамі, СССР—ідэямі, ну, а мы знача гэтым самым даем аб сабе знаць...—

— Ага, разумею, разумею! Чытаў як гэта Ён вас хрысьціў! А за што паслоў называў прастытуткамі?

— Прастытуткамі? За тое, кажа, што шмат якіх выкарыстаў, падчас маёвага яру ў 26-м годзе!—Ага, памятаю, памятаю — памагалі, значыцца. А што гэта за слова татая—„Октр'еваць“?—задаю пытаньне.

— Гэта—тлумача — такая апэрацыя над старым, тры дні да сьмерці маючым, чалавекам — адмаладжваюць. Італьянскі дохтар выдумаў.—

А што яна—гэта апэрацыя надта балючая? Памагае старому карчу?

— Якое там, чорта, памагае! Трохі працягне, пабрыкаецца і ўсе роўна падыхае — ад законаў натуры ня выкруцішся! А што да балючасьці, дык ня ведаю добра. Італьянцы-ж неяк церпяць, але як мы, кволыя, з сапсутымі нэрвамі людчыкі, дык ці не заравем толькі гвалту?!...—

Запісаў і пытаю далей — што будзе з Соймам пасьля вось гэтага, апошняга выстралу з бізуна?

— Ёсьць—кажа—два выхады.

Адзін—гэта паслом стаць на калені і сьпяваць пад дырыжорствам слаўнага „Псальмы“ „Цябе, шэфе, хвалімі“, па камандзе, калі трэба, падняць руку і сядзець ціханька, або каяцца, калі чуешся грэшным, б'ючы кулаком у грудзі. Заняткі, як бачыце, ня цікавыя, але выгадныя—дыеткі, пасады, адтуль крыху адсюль—зьбярэцца!

Або другі—дастаць бізуном па лыдках і ехаць, плачучы, да хаткі, а калі каторы захоча з гонарам, дык на Лукішкі, або ў Вронкі, а тымчасам распачнецца гэта самае „Октр'ёване“.—Гм... або дождж, або пагода, але якая з гэтых магчымасьцяў больш магчымая?

— Ня ведаю добра—гавора мой пасол— хутчэй усяго, што першае.

„Адзінка“ ўжо робіць „цьвічэньні“, пэпээсы прыслухоўваюцца і ня „проч-бы“ заўтараваць, але троха нібы стыдаюцца, дасюль за бязбожнікаў „лічыліся“—нялоўка. Пакрыўляюцца, для адводу воч, троха, а пасьля пойдзе, як па масьле!

Найгарэй, дык гэта нашым сэльсаюзьнічкам, спадаркам: прыклекчыць, няма як— стыд вочы выесьць, а йначай... страціш дыеткі і пашану, ну, ведама, сярод каго! Круцяць, гіцлі, патыліцамі! Яромка напявае пад нос—„Эх дыеткі, вы дыеткі“... ды так сумна, жаласна, ажна небарака Юхновіч заліваецца слязамі—што я, стогне, рабіць буду, як страчу гэту „пасаду“?! Хоць бы футарок пасьпеў купіць! Меў дзьве двесяцінкі і тыя прадаў, каб папоўніць „недачоты“ ў гмікнай касе, ды ад суду выкруціцца!—ажна шкода бедных! „Ойцец“ Станаўкевіч раіць ім падаць „чалабітную“, каб знача пазволілі троха бавіцца ў апазіцыю, у „вальку“ за сялянскую долю—хутчэй ўсяго, што так і зробяць.

Так што можаш сьмела пісаць, што гэта першае будзе—на каленькі, значыцца!—

А трэцяга, пытаю, выхаду нямашака?

— Ёсьць і трэці — гэта, як Той казаў, пасьля маёвага — „владза з уліцы“, вядома, ня з шырокай, а з вузенькай, бруднай, з сутарэнаў і з пад сялянскіх стрэх, але гэтага вельмі баяцца і паны, і пэпээсы і ўся ўгадовая хэўра—не дапусьцяцца, скарэй згодзяцца на круля. Ведаеце, скончым пра гэта гутарку, а то „вывяд“ Ваш і ўся часопісь, замест да чытачоў, можа апынуцца ў піўніцы акружнога!—

— Праўда, праўда, кажу, пакланіўся, падзякаваў і ходу. Лячу ў рэдакцыю — рады, што маю вывяд і да таго — бясплатны! Толькі, думаю, ці будзе мне з гэтага якая карысьць!

Але, здаецца, павінны і мае інтарэсы папрaвяцца, як пачну даваць гэтыя „вывяды“. Рэдактары-ж ды супрацоўнікі іншых газэт буржуямі жывуць, тысячамі аграбаюць падпіску, павінна і мае трахануць кішані, ды паглядзець, ці не забадзялася там залатоўка! Каб-жа гэтак! Справіў-ба тады чаравікі, кулек і ўжо тады спрабаваў-ба і да „шэфа“ каторага наведацца. Той-самы.

Выстаука Беларускага Хатняга прамыслу, культуры і мастацтва. 18-VIII — 12-IX 1928 г.

На паўночным кірмашу ў Вільні, што будзе сёлета ад 18 жніўня да 12 верасьня, Беларускае Навуковае Т-ва супольна з Таварыствам Беларускай Школы і Выдавецкім Т-вам ладзіць выстаўку беларускага хатняга прамыслу, беларускае культуры і мастацтва. Аддзел беларускага хатняга прамыслу абыймаціме па магчымасьці ўвесь промысел Заходняе Беларусі (Віленскае, Навагрудзкае, Палескае і Беластоцкае ваяводзтвы) і дзеля гэтага ўсім беларускім грамадзкім і культурна-асьветным установам трэба далажыць усіх стараньняў, каб беларускі промысел быў прадстаўлены па магчымасьці роўна. Выстаўка мае вялікае значэньне для разьвіцьця, як эканамічных так і культурных бакоў жыцьця працоўнага беларускага народу. Усім добра ведама, што хатні промысел часта становіць паважную часьціну бюджэту нашага беззямельнага і малазямельнага селяніна. Бяда, аднак, у тым, што промысел гэты ў шмат якіх галінах і мясцох ніколі не паляпшаецца: часта і дасюль вырабляюць тыя ці іншыя рэчы тым самым спосабам, якім карысталіся яшчэ нашыя дзяды і прадзеды, а тымчасам, калі-б увясьці новыя палепшаныя спосабы ці прылады, дык, затрачваючы той самы час ды значна менш энэргіі, магчыма было-б атрымаць значна больш прадукту вытворчасьці. Пры вырабе палепшанымі спосабамі ды ўжываючы новыя больш адпаведныя прылады часта і якасьць выробляных рэчаў паляпшаецца, а гэтым самым, ёсьць ведама, падыймаецца і іх цана. Адным словам, мы павінны прылажыць усе высілкі да таго, каб прамысел наш хатні надняць на адпаведную вышыню, а гэта магчыма толькі тады, калі мы яго ўсебакова пазнаем ды адпаведна з'арганізуем. Выстаўка як раз дасьць нам магчымасьць дакладна пазнаць усе галіны хатняга прамыслу ды паможа навязаць цясьнейшую сувязь паміж паасобнымі куткамі нашае Бацькаўшчыны. Наступным этапам нашых культурна-грамадзкіх і гаспадарчых установаў будзе — парупіцца аб тым, каб адпаведным спосабам з'арганізаваць усіх хатніх прамыслоўцаў, ды памагчы ім у дастаўцы неабходных матар'ялаў на выраб, а так-жа наладзіць каапэрацыйныя крамы дзеля збыту гатовых рэчаў, каб гэткім спосабам памінуць зусім непажаданых пасрэднікаў, якія яшчэ нажаль дагэтуль, як паразіты, сядзяць на целе беларускага селяніна.

Прыдаючы такім чынам вялізарнае значэньне выстаўцы беларускага хатняга прамыслу, Таварыства Беларускае Школы заклікае ўсіх сяброў Т-ва да працы па зьбіраньню экспанатаў (рэчаў хатняга вырабу, якія будуць выстаўлены) на выстаўку.

Гурткі Т-ва Бел. Школы павінны пастарацца сабраць па магчымасьці ўсе рэчы хатняга прамыслу (па аднаму экзэмпляру рознага сорту) сваё ваколіцы і даставіць у сваю Акружную Управу не пазьней 5-га жніўня, а Акружныя Управы неадкладна іх вышлюць у Вільню. У гэтай справе ўсе Акружныя Управы атрымаюць ад Галоўнае Управы адпаведныя дакладныя інструкцыі. Перасылка і дастаўка сабраных рэчаў адбываецца на кошт Галоўнае Управы. Самыя рэчы павінны быць ад іх гаспадароў, ёсьць ведама, пазычаны, бо Т-ва ня мае грошай, каб усе патрэбныя экспанаты купіць. На кожнай рэчы павінна быць азначана: з якой вёскі, воласьці і павету, а так-жа імя і прозьвішча таго, хто яе рабіў. Галоўная Управа на днях вышле друкаваныя лісткі (ankietny list) якія і будуць далучаны да кожнае рэчы — пад адпаведным нумарам. На кожную рэч таксама павінна быць выстаўлена цана, за якую гэтая рэч можа быць прададзена, або зазначана: „не прадаецца“, калі ўласьнік (собсьнік) прадаць яе не згаджаецца. За прададзеныя рэчы грошы будуць пераслана ўласьнікам, непраданыя-ж рэчы Галоўная Управа верне на свой кошт праз Акружныя Управы.

Між іншым трэба сабраць экспанаты наступных вырабаў:

1) Тканіны: палотны, сукны, ручнікі, посьцілкі, андаракі, хусткі, абрусы, паясы і т. п.

2) Ганчарныя вырабы: гаршкі, міскі, збаны, гладышы, дзіцячыя забаўкі і г. п.

3) Вырабы з дрэва: колы, вазы, брычкі, сані, абады, калаўроткі, розныя рэчы з чачоткі, бочкі, вёдры, конаўкі, лыжкі і іншае кухоннае судзьдзё, гонты, верацёны, дзіцячыя забаўкі і г. п.

4) Вырабы з саломы і лазы: вульлі, лубкі, капялюшы, кашы, палукашкі, сявенкі і г. п.

5) Рукавіцы і панчохі, шапкі, валенкі, лямцы і г. п.

6) Рымарскія вырабы: хамуты, аброці, сёдлы і г. п.

7) Гарбарныя вырабы: шкуры рознага сорту, аўчыны і г. п.

8) Цэгла, кахлі, дахоўка і г. п.

Зразумела, што цяжка было-б пералічыць кожную рэч;—на месцы Акружныя Управы і Управы гурткоў самі лепш вырашаць, што найбольш адпаведнае з іх ваколіцы павінна быць прадстаўлена на выстаўцы і дзеля гэтага зусім на іх пакладаемся; у прыпадку пэўных сумліваў зварочвацца ў Галоўную Управу дзеля атрыманьня выясьненьняў.

Дык да працы, сябры Т-ва Беларускае Школы! Пакажам усяму сьвету, што здольны зрабіць мазольныя рукі беларускага рабочага-селяніна!

Усе рэчы шматлікага хатняга промыслу Беларусі павінны быць на выстаўцы!

Хай гэта будзе пачаткам да палепшаньня і спосабаў і прыладаў вырабу!

Хай выстаўка злучыць усіх хатніх прамыслоўцаў-рабочых сялян!

Хай праз выстаўку паўстане магутная арганізацыя беларускага хатняга промыслу!

Хай жыве, цьвіце і разьвіваецца беларускі хатні промысел, беларуская культура і мастацтва.

Галоўная Управа
Т-ва Беларускай Школы.

Анкетны лісток

аб экспанатах, зьбіраных на Выстаўку Беларускага Хатняга Промыслу пры Паўночным Кірмашы ў Вільні 18./VIII.—12./IX. 1928 г.

1. Экспанат . . . .
(драбязны назоў рэчаў, якія выстаўляюцца)
2. З якога матар'ялу . . . .
3. Хто рабіў . . . .
(імя, прозьвішча) (век)
4. Кошт матар'ялу (залежна ад мясцовасьці) . . . .
5. Назоў мясцовасьці. { вёска . . . . павет . . . . воласьць . . . . }
6.*) Час, патрачаны на сам выбар прадмету з (сырога) матар'ялу . . .
7. Адрэс нажытага (купленага, пазычанага) экспанату . . . . . .
8.*) Прадажная цана на месцы . . . .
9.*) Колькі людзёў на месцы і калі займаецца гэтай работай? . . . .
10.*) Колькі дзён у годзе займаюцца гэтымі вырабамі? . . . .
11. Дзе і як дастаюць матар'ял для вырабу? . . . .
12. Дзе і каму прадаюць? . . . .
13. Што патрэбна для палепшаньня промыслу? . . . .
14. Спосаб вырабу экспанатаў (прыкл. тканіны ў колькі нітаў—4, 6, 8 і гэт. пад.).

Пытаньні, азначаныя зоркай, абвяшчацца ня будуць, а патрэбны толькі дзеля ведама Камітэту па арганізацыі выстаўкі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Каля зьмены Канстытуцыі.

Усе палітычныя кругі Польшчы пераконаны і спадзяюцца ў хуткім часе розных неспадзяванак і навет „сэнсацый“ у ўнутраным жыцьці Польшчы. Такое спадзяваньне мае сувязь з адкіданьнем думкі аб выездзе Пілсудскага ў Румынію, які астаўшыся ў Польшчы вядзе, як падаюць газэты, значна ажыўленую дзеяльнасьць, некаторыя-ж газэты стараюцца навет выясьніць прычыны затрыманьня Пілсудскага ў Польшчы.

Найцікавей гэтыя прычыны тлумачыць Львоўская (польская) „Хвіля“ з 12-VII г. г. сваім паведамленьнем з Варшавы.

Успомненая газэта піша: „Запэўніваюць, што заграмічная палітыка Польшчы, за якую адказвае разам з мін. Залескім таксама і Пілсудскі, вымагае прысутнасьці міністра ваенных спраў у краі (у Польшчы). Ход польска-літоўскіх перагавораў і ведамае становішча літоўцаў, як і апошняя нота у адказ на літоўскую ноту, маюць прычыніцца да прыгатаваньня акцыі, якая імкнецца да нахіленьня літоўцаў на больш канкрэтныя ўступкі.

Аднача сна з чаканьнем неспадзяваных зьменаў у замежнай палітыцы, павялічваюцца і факты, указваючыя, што трэба чакаць зьменаў і у ўнутраным жыцьці Польшчы — зьмены Канстытуцыі, якая будзе праведзена з Соймам або і бяз Сойму.

Зьмена Канстытуцыі мае адбыцца на карысьць павялічэньня ўлады Прэзыдэнта. Пасьля такой зьмены, Прэзыдэнт меў-бы права „veta“ (пратэсту і забароны) ў-ва ўсіх соймавых пастановах, навет чыста законадаўчага характару; міністры тады былі-б адказнымі ня перад Соймам, а перад Прэзыдэнтам.

Грунт пад зьмену Канстытуцыі падгатаўляецца ўрадавымі пасламі „на правінцыі“ ад 6-га г. месяца, калі паслы атрымалі на гэта загад. З другога-ж боку ў „цэнтры“ ўраду цяпер йдзе пільная праца над выпрацоўваньнем новай Канстытуцыі.

У гэтай справе кожная газэта піша пасвойму, хоць і вельмі блізка адна да другой. Мусім тут адзначыць, што аб ёй піша цытаваная ўжо „Хвіля“ (з 12 г. м.).

„Важнейшых падзеяў спадзяюцца ўсе 12 жніўня, калі з прычыны зьезду ў Вільні легіёністаў і „стральцаў“ будзе там прысутны і Пілсудскі. Пілсудскі мае сказаць вялікую палітычную прамову, вялікага значэньня.

У гэтай прамове, публічная апінія будзе мець магчымасьць (аказію) пазнаёміцца з канкрэтнымі плянамі ўраду аб рэвізіі Канстытуцыі“.

„Польскае Слова“-ж падае, што ў сувязі з гэтай прамовай ў Варшаве маюць сабрацца ў поўным камплекце міністры.

Ужо гэтыя інфармацыі ўказываюць, што Польшча стаіць перад пакуль-што няведамымі, але не малаважнымі падзеямі, у ліку якіх пэўна будзе і роспуск цяперашняга Сойму.

Ці ня з гэтай толькі прычыны ўрадавыя паслы і сэнатары „пастанавілі паабяцаць“ беларусам некаторыя з належачых нам правоў у галіне асьветы, заранёй ведаючы, што гэта толькі гутарка, дзеля таго, каб замыліць вочы такім наіўным беларусам, як „блажэнны“ — Янка Спадар...

ППС ізноў здрадзіла працоўных.

30-га мінулага чэрвеня ў М-ве Працы і Грамадзкай апекі адбылася канфэрэнцыя паміж прадстаўнікамі работнікаў шклянага прамыслу і прадстаўніком Саюзу Шкляных Гутаў Баліньскім. Работніцкія прадстаўнікі належалі да двух групаў — адны да папэсаўскіх клясавых Саюзаў, другія да Работніцкіх Прафэсыянальных Саюзаў.

З самага-ж пачатку ППС-ы зажадалі, каб канфэрэнцыя была паасобнай, вынікам чаго канфэрэнцыя з прадстаўнікамі Работ. Праф. Саюзаў адбылася папаўдні.

Абвясьціўшы, што ППС-ы ўжо падпісалі ўмову і згадзіліся ад імя ўсіх работнікаў шкляных гутаў у Польшчы на ахвяраваную фабрыкантамі 6 працэнтавую падбаўку,—перш Баліньскі прабаваў угаварыць работнікаў, а потым, бачучы, што гэта надарма, пачаў, пагражаючы, дамагацца ад іх падпісаньня напрыклад „сацыялістаў“ прапанаванай фабрыкантамі ўмовы.

Работнікі ад такога „сацыялістычнага прыкладу“ катэгарычна адмовіліся, заявіўшы, што застаюцца пры сваім старым жаданьні — 25 прац. падбаўкі.

Добрыя „абаронцы працоўных“, як сябе называюць ППС-ы! — умеюць ужо і пры „адчыненых“ і пры „зачыненых“ дзьверах сьпіхаць работнікаў у тое бяздольле нэндзы, якім работнікі абязаны толькі „руплівай пэпэсаўскай апецы“ над сабой — дык чакайце-ж ад іх хуткай і адпаведнай заплаты.

Лёкаўт фабрыкі Пазнанскага ў Лодзі.

Фірма прадзельні Пазнанскіх у Лодзі абвясьціла на неабмяжаваны час лёкаўт (недапушчэньне да працы) сваім работнікам. Прычыны — забастоўка работнікаў і моцнае „патурбаваньне“ імі двух вышэйшых дырэктароў фабрыкі.

Такім спосабам 1800 работнікаў жыве бяз працы — „пануе“.

Аднача сна з абвяшчэньнем лёкаўту, фірма абвясьціла ў-ва ўсёй прэсы, што ўсяму вінаваты работнікі.

Пэўна-ж!—„на беднага Макарэа і шышкі сыплюцца“.

Заграніцай.

Радавая прэса аб разрыве польска-літоўскіх перагавораў.

Маскоўскія „Известия“ лічаць нязьмерна сумным ды небясьпечным фактам сарваньне перагавораў, якія вяліся ў Коўне. Абедзьве староны будуць пэўне-ж перакідаць узаемна адказнасьць за правал адна на адну. Газэта цьвердзіць, што — ані Польшча ані Літва ня выказалі даволі сільнай волі ў напрамку паразуменьня ды камяраміcу, магчымага для прыняцьця абедзьвюма старонамі. Зусім ня прыемны для Літвы польскі праект, які трэбуе, каб Літва выракалася цалком сваіх дамаганьняў. З другога боку—зусім незразумела і становішча Літвы, якая высунула запраўды-ж няпрымірымакрайні праект, які даў Польшчы зачэпку да разрыву перагавораў, узмоцніўшы ў Польшчы ўплывы зачэпных элемэнтаў, заклікаючых да рашучага зьліквідаваньня „літоўскага пытаньня“. Пагроза новых камплікацыяў можа быць ухілена толькі тады, калі ўся эўрапэйская апінія катэгарычна выступіць проці новых авантураў дый змусіць абедзьве староны, каб дайшлі да паразуменьня прынамсь у справах, абмінаючых усе спорныя пытаньні, дзелячыя абодва краі“.

„ПАТ“. 12./7.

Водгукі непасьпеху польска-літоўскіх перагавораў.

Нямецкая прэса падчырквае, што польскі мэмарыял, высланы да Лігі Нацыяў у справе становішча Літвы ў справе Вільні, у канцы (ў дадатку) зрэдагаваны ў вельмі вострым тоне. Гэты „дадатак“ да мэмарыялу кажа, што — калі Літва ня зьменіць свайго становішча, тады польскі ўрад, пазываючыся на § 11 статуту Лігі, зьвернецца афіцыяльна да яе Рады, каб яна ўмяшалася ў справу, якая пагражае сусьветнаму міру. Калі-ж літоўскі ўрад адмовіцца ад сваіх недарэчных дамаганьняў, польскі ўрад гатовы прадаўжаць перагаворы ў Кэнігсбэргу, далажыўшы ўсе стараньні, каб дайсьці да паразуменьня. („Кур. Варшаўскі“ 13/7).

Карэспандэнт той-жа газэты („Кур'ера Варш.“) даносіць з Масквы: „Радавая прэса таксама вельмі цікавіцца рэзультатамі польска-літоўскіх перагавораў. Газэты прадбачаць, што на васеньняй сэсіі Лігі Нацыяў польска-літоўскі спор будзе вырашаны. Літву будзе падтрымліваць Нямеччына. Польшчу — Англія і Францыя. Рашэньне, трэба думаць, не задаволіць Літву, і ўжо ў кастрычніку выбухнуць выпадкі (?), якія пацягнуць за сабой нязьмерна паважныя пасьледзтвы“... (С.Т.).

Нямецка-літоўскія перагаворы.

Літоўская прэса дае шмат месца справе перагавораў з Нямеччынай аб заключэньні гаспадарчага трактату. Прэса цьвердзіць, што спор ідзе цяпер аб тое, каб Нямеччына—за вольны ўвоз сваіх фабрыкатаў у Літву заплаціла-б такім-жа неабмежаваным увозам да сябе літоўскага быдла. Але, дадае літоўская прэса, што у бліжэйшых днях усе труднасьці перагавораў будуць урэгуляваны—„з меркаваньняў палітычных“: Літва за ўсялякую цану хоча мець Нямеччыну прыяцелям — на васеньняй сэсіі Лігі Нацыяў, калі будзе, мо' канчальна, разглядацца справа польска-літоўскага спору з-за Вільні.

„Ваенныя настроі Літвы“.

Рыская прэса ў карэспандэн. з Коўны рысуе—„ваенныя настроі, пануючыя ў Літве“. „Вальдэмарас падчырквае ўсьцяж у сваіх прамовах, што спор з-за Вільні можа выклікаць новую сусьветную вайну, — таму, што ён датычыць цэлага зложанага вузла нацыянальных праблемаў Усходняй Эўропы, дый вяжацца ў дадатку — з спорам аб „калідор“, з украінскай праблемай дый з справай польска-радавых стасункаў. Дык няма нічога дзіўнага, кажа газэта „Рыскі Агляд“, што ў сучасны мамэнт у публічнай апініі жыва абгаварваецца магчымасьць новай вайны. Пальнага матар'ялу назьбіралася даволі — запэўняе ўсьцяж літоўскі афіцыяльны орган. („А.Т.Е.“ Рыга, 14./VII.).

Няменш сэнсацыйную „вестку з Масквы“ друкуе адна з нямецкіх газэтаў, — быццам радавы ўрад пастанавіў выслаць у Коўна спэцыяльную ваенную місію, з ген. Будзённым на чале. Місія мае абгаварыць справу ваеннага кантакту паміж чырвонай арміяй і літоўскім войскам...

Тую ж самую „вестку“ падае таксама і нацыяналістычная „Біржоўка“, тэлеграма з Масквы афіцыяльна запярэчыла гэтую вестку.

Кітай пачынае даходзіць да здароўя і волі.

Англійскія весткі кажуць, што нацыянальны ўрад мае ў найбліжэйшы час выслаць урадам Англіі, Амэрык. Штатаў, Японіі, Францыі і Італіі аднолькавыя ноты, у якіх патрабуе адклікаць усе ваенныя караблі, знаходзячыяся на рацэ Яе-Тсэ-Кіянг. Нота сьцьвярджае, што ваенныя падзеі ўнутры краю закончыліся — дык няма ніякай патрэбы трымаць гэтыя караблі ў мэтах аховы чужаземцаў.

Тварэньне ўраду ў Югаславіі.

З Белграду даносяць, што ген. Гадзіч прыступіў да стварэньня новага „не палітычнага“ ўраду. Запрасіўшы да сябе ўсіх павадыроў соймавых партыяў, ён запытаўся, якое становішча яны займуць, калі новы не палітычны габінэт — замест таго, каб безадкладна распусьціць парлямант ды расьпісаць новыя выбары, запрапануе гэтаму парляманту — ратыфікаваць трактат у Нэттуно (трактат з Італіяй), і прыняць закон аб заграмічнай пазыцы. Напомнім, што італьянска-англійская дыпляматыя згодна націскаюць на Югаславію, каб яна ратыфікавала вельмі выгадны для Італіі Трактат у Нэттуно, затрымаўшы да гэтай ратыфікацыі (зацьверджаньне парлямантам) абяцаную і гатовую ўжо вельмі значную пазыку.

Дэмакраты (ўрадавыя) адказалі новаму прэм'еру, што іх становішча залежыць толькі ад праграмы новага ўраду. Пасол Прыбічэвіч (павадыр незалежных дэмакратаў) заявіў — ад імя сваей апазіцыйнай сялянска-дэмакратычнай коаліцыі, што апазіцыя ні ў якім выпадку ня будзе супрацоўнічаць з парлямантам сучаснага складу. Калі новы ўрад мае падтрымліваць існаваньне сучаснага Сойму, цягнучы з выбарамі ў новы, Харваты прымуць гэта за правакацыю. Апазіцыя трэбуе безадкладнага роспуску парляманту і новых выбараў.

Белградзкія газэты сцьвярджаюць, што ген. Гадзіч мае стварыць „чыноўніцкі габінэт“, які займецца, апроч бягучых спраў, толькі правядзеньнем новых выбараў. Гэтае рашэньне Гадзіча (пэўне-ж і караля) выклікала здаволеньне сярод апазіцыі. Радзіч заявіў, што зараз-жа ўвойдзе ў палітычны кантакт з новым Соймам. Як ведама, новы фаховы габінэт мае быць складзены напалову з сэрбаў і харватаў — каб забясьпечыць поўную справядлівасьць выбарнай акцыі.

Замах на начальніка белградзкай паліцыі.

13-га ліпня ў Белградзе зроблены замах на начальніка сталічнай паліцыі Лазіча. Лазіч цяжка ранены. Забойца другім стрэлам з рэвальвэру забіў сябе на месцы. Венскія газэты тлумачаць замах — загадам, дадзеным Макенонскай Рэвалюцыйнай Арганізацыяй, якой страшэнным ворагам быў Лазіч.

Наша хроніка.

З жыцьця Віленскае Белар. Гімназіі. На дырэктара Віленскае Бел. Гімназіі Галоўная Управа Т-ва Бел. Школы ізноў запрасіла папярэдняга дырэктара—гр. С. Паўловіча.

Рэха Грамады. Пад загалоўкам: „Абаронцы Грамады", 161 № „Слова" падае наступную вестку:

„17. VII. на 10-ым кілямэтры шасы, вядучай у Рэшу, нявыкрытыя дагэтуль спраўцы вывесілі на прыдарожным дзераве камуністычны штандар з надпісам: „Жадаем выпушчэньня ўвязьненых сяброў Грамады".

Вялізарны ўраган у Зах. Беларусі. У мінулым тыдні 4/VI. праз Заходнюю Беларусь пранесься вялізарны ўраган, прынёсшы страшэнныя страты, а навет поўнае жабрацтва многім нашым сялянам, а іншым дык і сьмерць. Ураган прайшоў амаль не па ўсей Заходняй Беларусі, а іменна: праз Віленскае, Беластоцкае, Палескае і Наваградзкае ваяводзтвы. Найбольш пацярпелі — Баранавіцкі, Ваўкавыскі і Горадзенскі паветы, у якіх ураган трываў аж па 20 мінют. Ураган меў тут такую страшэнную сілу, што зьмятаў з дарогі едучыя фурманкі і ламаў і крышыў усё, што толькі пападалася на яго дарозе. Як сьлед такой шалёной віхуры, на абшарах гэтых паветаў засталіся павырываныя ўсе тэлеграфныя стаўбы, павываварачваныя і павырываныя з каранём сотні дрэваў, пазрываныя з многіх хатаў стрэхі і, самае горшае—зусім зьнішчаныя пасевы, апрача таго, некалькі чалавек забітых пярунамі ці прыдушаных насьмерць чым іншым.

У Горадзеншчыне ўраган пачаўся зразу папаўдні. Хмары былі такія густыя і чорныя, што а трэцяй гадзіне было цёмна, як ўночы. У самой Горадні віхор „раскрыў" многа дамоў, а між імі і жаўнерскія казармы, пярун стрэліў у Касу Хворых і павырываў з карэньнем і паламаў многа найстарэйшага больш як стогодняга дрэва.

У Друскеніках пярун удэрыў у касьцёл, дзе забіў 2 жанчыны і адну моцна кантузіў, а ў Азёрскім надлясьніцтве паламаў бяз мала ўвесь лес.

У Ваўкавыскім павеце найбольш пацярпела мястэчка Забеліна, дзе бура зьнішчыла да каліва пасевы, пазрывала чуць ня ўсе стрэхі. У жанчыны, працаваўшай ў полі блізка мястэчка, калі яна ўцякала ад ўрагана, вецер вырваў з рук дзіця і насіў яго некалькі дзесяткаў мэтраў. А на жалезнадарожнай лініі каля Ваўкавыска наляцеўшая бура перавярнула вагон, які забіў адразу 2 работнікаў і некалькі цяжка параніў. Таксама ў Віленшчыне пацярпеў і Маладэчанскі павет, у якім бура з навальніцаю трывала аж 3 гадзіны. У маёнтку Брыгідполе забіта пяруном Марыля Карчыцкая з вёскі Граніца. У Градзецкай воласьці пяруны выклікалі цэлы рад пажараў. У Маладэчанскай воласьці ў вёсцы Шміры пяруны забілі некалькі каней і запалілі некалькі хатаў.

Трэба адзначыць, што гэта ўжо трэцяя бура ў гэтым годзе ў Маладэчыне.

У самай Вільні ўраган, апрача поўнага парваньня тэлефонічнай і тэлеграфічнай лучнасьці і некалькі выбітых вокан, не зрабіў большай шкоды.

У Беластоку віхар моцна ўшкодзіў паравоз і разьбіў 2 вагоны. Папхнутыя віхрам вагоны наляцелі на працуючых работнікаў, прычым аднаму з іх, Родзевічу, адрэзала коламі правую нагу, а другому, Забеляну, абедзьве нагі.

У Наваградку віхар задаволіўся толькі некалькімі стрэхамі ды ламаньнем дрэў і ніщчэньнем акалічных пасеваў.

Такая-ж самая бура, з навальніцай і пярунамі, прайшла і на польска-радавым парганіччы, у аколіцах В.-Хутароў, Краснага і Івянца, выклікаўшая там многа пажараў, паламаўшая многа дрэў, „параскрываўшая" дужа хатаў і зьнішчыўшая пасевы, якія яшчэ некалькі дзён пасьля яе былі заліты вадою.

Мусім адзначыць, што гэтыя яшчэ далёка не дакладныя весткі аб тым вялікім няшчасьці, якое спаткала шырокія працоўныя сялянскія гушчы Заходняй Беларусі.

Цяпер мусім задацца пытаньнем — як памагчы сабе, як вырабіцца з гэтага гора?

Ведаючы і так жабрацкае становішча беларускага сялянства Зах. Беларусі, вельмі трудна спадзявацца нам на сваю ўласную як найхутчэйшую помач. Самі сабе мы пры ўсей нашай працавітасьці і цярплівасьці маглі-бы памагчы толькі праз якісь час, а тут—„пакуль сонца ўзыйдзе, раса вочы выесьць",—тут патрэбна хуткая помач—дзяржаўная помач.

Аб шкодах, прычыненых бурай ў Лідзкім павеце, надыйшлі новыя весткі. А іменна ўрагаг прайшоў над мясцовасьцямі: Ганчары, Ельня, Шайбакі, Геранёны, Чэхавічы, Мілевічы, Гердзішкі і Сяльцо. У гэтых мясцовасьцях ураган пазрываў амаль ня ўсе стрэхі, быў прычынай многіх пажараў і іншай вялікай матэр'яльнай страты. На дарозе Ліда-Наваградак бура вывернула больш 100 старых дрэў.

Так жа і ў Стаўпецкім павеце, на гасьцінцы: Турэц-Карэлічы-Наваградак каловы рух быўна некалькі дзён перапынены з прычыны множаства вывернутых старых бярозаў.

На абшарах-жа ўсяго Наваградзкага ваяводзтва ў часе ўрагану забіты пярунам 6 чалавек і адзін падаючым дзеравам. Дакладнага аблічэньня шкодоў яшчэ няма.

У Вялейскім павеце у часе буры забіта пяруном 40 годняя жыхарка вёскі Н.-Губы, Ільскай воласьці, Паўліна Кулеша. У вёсцы Халопцы пярун спаліў будынкі гаспадара Сьцяпана Мікалаевіча. Апрача гэтага, бура ў розных мясцовасьцях пазрывала стрэхі, панішчыла пасевы і нарабіла яшчэ і іншыя шкоды.

У часе буры 4 г. ліпня ў вёсцы Лаўна, Скідэльскай воласьці (Горадзеншчына) ад пяруна запалілася гумно Аляксандра Жука. Спаўшая ў гумне сястра гаспадара не магла выратавацца і згарэла разам з гумном.

У той жа самы дзень ад пяруна згарэлі будынкі Янкі Булаўскага з вёскі Тахлеўцоў (Ашмяншчына).

Таго-ж 4 ліпня ад пяруна згарэў хлеў і адрына Янкі Латоўскага, з фальварку Мілідаўшчына, Дзісьненскага павету. У гэтых будынках згарэла 13 авец, 6 гусей, вупраж і земляробныя прылады.

Шкоды ўрагану ў Лідчыне. Дагэтуляшнія абліченьні стратаў Лідчыны ад урагану дасягаюць 3-х мільёнаў злотых, з чаго 1 мільён прыходзіцца на будынкі, а рэшта на збожжа. У Астрынскай, Новадворскай і Сучынскай валасьцёх амаль няма хаты, з якой ня была-б зарвана страха. У 10-х вёсках гэтых валасьцёў дык стрэхі паздзіраны навет з вязаньнем (кроквамі).

Забастоўка. У маёнтках князя Сапегі Пяратасоўчына і Каменка выбухла забастоўка земляробных работнікаў (парабкоў). Прычына забастоўкі—невыплачваньне залеглай ардынарыі. Бастуючыя згаджаюцца прыступіць да працы зараз-ж па выплаце належнай платы (ардынарыі). Забастоўкай кіруе прафэсіянальны саюз земляробных работнікаў у Горадні.

Страшны пажар. Надоўячы ў вёсцы Старая Спушча, Дзембровскай воласьці, Лідзкага пав. выбух вялікі пажар, спаліўшы ў хуткім часе 121 забудаваньне. У часе пажару згарэла 30 штук жывёлы. Адна жанчына моцна апалена. Страты каля поў-мільёна зл.

390 непаразуменьняў. Як падае прэса, у чэрвені ў Вільні занатавана 390 непаразуменьняў паміж дазорцамі дамоў і гаспадарамі. Прычыны — эканамічныя (зборная ўмова).

Зладзеі абакралі вастрожнага дазорцу. У дазорцы Лукішскага вастрогу Фаліксона Пучка зладзеі ўкралі службовы мундзер разам з 250 злотымі. Злодзея ня знойдзена.

Уцечка вязьня. Як падае „Слова" № 158, з Лідзкага сьледчага вастрогу ўцёк вязень, некі Міхалка Балка. Балка ўцёк з будаўляных работаў, на якіх працаваў.

Пагоня і розыскі пакуль-што яшчэ бяз рэзультату.

Безрабоцьце ці пятля? У мінулым тыдні ў Вільні на Панарскай вул. № 14 павесіўся з безрабоцьця 24-гадовы работнік.

З браку засобаў жыцьця. З браку засобаў жыцьця 19-годняя Алеся Матэйка ў Дукштах выпіла значную дозу воцту. Ня гледзячы на хуткую лякарскую помач, стан здароўя Матэйчыхі безнадзейны.

Ізноў падпальшчыкі. Уночы з 15 на 16 ліпня згарэў фальварак Кутра, Варнянскай вол. Усталена, што пажар выбух быццам ад падпаленьня. Сьледзтва, шукаючае падпальшчыкаў, не дало ніякага рэзультату.

З Т-ва Бел. Школы.

Праца Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

✕ За месяц VI-28 г. Акружной Управай Т-ва Бел. Школы ў Глыбокім былі наладжаны наступныя спэктаклі-вечарыны: 4/VI-28 г. ў Германовічах і 5/VI г. г. ў м-ку Лужках. Ставілі „Суд" і „Міхалку"; 16/VI г. г. ў м-ку Глыбокім у салі кіна „Копса" з духавым аркестрам і скокамі; 17/VI—г. г. выезд у м-ка Пліса за 23 км. Ставілі „Суд" і „Міхалку" і дэклямацыя наступных вершаў: „Ворагам беларушчыны", „Родны край", „Покліч" і „Пагоня". Прысутныя запоўнілі салю, з якіх большасьць—сяляне і навет шляхта, якія сыпалі град воплескаў і падзяк; 29/VI-28 г. ў м-ку Глыбокім—адыгралі „Страхі жыцьця" і „Міхалку". Публіка, гледзячы на ўдалую гульню, як-бы сама перажывала свае „страхі жыцьця". Праўда, былі сякія такія недахопы, але бадзёрасьць і захопленасьць роднай справай за хвілю сатрэ гэтыя недахопы. Навет польская інтэлігенцыя дзівілася, скуль бярэцца такое мастацтва ў Беларусаў.

Чэсьць Вам, браткі і сястрыцы, за Вашае ініцыятарства ў культурнай працы! Хадайцеся, як мага. Прачнуўшыся гэтак ад сну і нягоды—другіх будзеце церабіць наш цярновы шлях.

Дык усе, як адзін, за вызваленьне прыгнечанага Народу!

✕ У суботу 7-га ліпня г. г. Баранавіцкім Гуртком Т-ва Бел. Шк. быў наладжаны спэктакль-вечарына. Гулялі трагадыю Ф. Аляхновіча „Дзядзька Якуб" і камэдыю К. Каганца „Модны шляхцюк", якая прайшла вельмі жыва і весела. Гром доўга незмаўкаемых воплескаў выклікала „Лявоніха", выкананая пад музыку ваеннага аркестру. Палова чыстага збору пойдзе на бібліятэку Гуртка, а другая палова на будову „Дому Беларускай Культуры" ў Вільні.

Сур'ёзная праца рэжысёра і сумленная праца артыстых над мастацкім выкананьнем сваіх роляў запэўніць ёй далейшы пасьпех.

А Д О З В А.

Да сяброў і сымпатыкаў Т-ва Белар. Школы ў Дзісьненшчыне.

Браты! ці-ж мы сталіся сябрамі і сымпатыкамі Т-ва Бел. Шк. для таго толькі, каб мець ганаровы білет роднай культуры? Не!

Сьведамасьць прымусіла зрабіць гэта, мінуўшчына падсказала нам шукаць дошку ратунку ў Арганізацыі, каб змагчы крыўду і зьдзекі, цемру і бяду, якія пануюць у працоўных масах!

Але сёньня патрэбныя засабы на наш пралетарскі культурны рассаднік.

Вось тут Акр. Упр. Т-ва Бел. Шк. Дзісьненшчыны зьвяртаецца да сваіх сяброў і сымпатыкаў з просьбай прыпомніць яшчэ раз свой грамадзкі абавязак, сваё піонэрства ў нашым Адраджэньні і прыслаць згодна статуту сяброўскую складу, у праціўным выпадку праца наша, якая вялася да сёньня старанна, пачне гніць амаль ня ў канцы сваёй мэты.

Дык, каму дорага нашая родная культура, каму дорага будучына працоўнага народу, няхай зьбярэ які грош і аддасьць належную сяброўскую складку, выслаўшы ў Акр. Управу.

Глыбоцкая Акр. Упр.
Т-ва Бел. Школы, Глыбокая, пав. Дзісьненскі.

П А Д З Я К І.

Гэтым Гурток Т-ва Бел. Шк. ў Манечы шчыра дзякуе тым грамадзянам, якія ахвяравалі грошы ў суме 21 зл. 90 гр., на карысьць бібліятэкі-чытальні пры гэтым-жа Гуртку.

✕ Мірскою Акружною Упр. Т-ва Бел. Школы быў наладжаны збор ахвяр на карысьць незаможных вучняў Бел. Гімназіяў. Сабрана: з в. Н.-Сьверцян—100 зл.; в. Цырабостынь — 1 зл., 92 яйкі, 13 ф. збожжа; в. Агацэвічы—4 зл. 20 гр. і 82 яйкі; в. Лукі—18 зл. 47 гр., 60 яек; в. В.-Жухавічы—2 зл. 85 гр., 80 яек; в. Скамарожкі—17 зл. 66 гр. і 1 п. 87 ф. жыта; в. В.-Слабода — 19 зл.; са скарбоначнага збору 1-га лютага г. г.—32 зл. 50 гр.; з паасобных грамадзян: Кастусь Сякач—50 гр. і Юльян Цьвірка—1 зл. 50 гр.; са скарбоначнага збору і падп. лістоў ад 6 да 12 траўня г. г. паступіла сума ў 465 зл. 38 гр. Грошы пераслана ў Гал. Упр. Т-ва Бел. Шк. ў Вільні.

Таксама 22 тр. г. г. наладзіла Акр. Упр. збор ахвяр на карысьць Нар. Дому Т-ва Б. Шк. ў Міры, на якім сабрана: з скарбонкі № 122—14 зл. 59 гр., з скарбонкі № 307 — 18 зл. 65 гр. і з скарбонкі № 309 — 20 зл. 46 гр.—разам 53 зл. 70 гр. Грошы пайшлі на закупку кніжак для бібліятэкі-чытальні пры Нар. Доме Т-ва Бел. Шк. ў м. Міры.

Усім асобам, якія давалі ахвяры, а таксама ўсім што зьбіралі іх, Акружная Управа Т-ва Бел. Шк. ў м. Міры шле шчыры дзякуй!

✕ Беларускае Навуковае Т-ва прыносіць шчырую падзяку за ахвяры і складкі на карысьць „Дому Беларускае Культуры ў Вільні" наступным асобам і ўстановам: 1) група вязьняў з турмы „Коронава"—гр. Рак-Міхайлоўскаму, Бурсэвічу і інш. за прысланыя 25 зл. 30 гр.; 2) Гуртку Т-ва Бел. Шк. ў вёсцы Жэрабковічы, каля Баранавіч за прысланыя цераз Сьцяпана Казаноўскага — 15 зл.; 3) Спачуваючым разьвіццю беларускае культуры і радным Ляхавіцкае гміны за прысланыя цераз В. Яцкевіча з вёскі Рачканы — 17 зл.; 4) Баляславу Копэртовічу — 3 зл.; 5) Баранавіцкай Акружной Управе — 10 зл.; 6) Працаўнікам Віленскага Цэнтр. Белар. Банку—4 зл. 50 гр. і 7) Працаўнікам Шінокага Аддзелу Бел. Каапэр. Банку—5 зл.

Паведамленьне.

Галоўная Управа Т-ва Бел. Школы падае да агульнага ведама, што сяброўскі білет Т-ва за № 2106, выданы на імя гр. Лабача Мікалая, ўневажняецца.

Галоўная Управа.

Карэспандэнцыі.

„Баданьні" школьных дэклярацыяў.

(Вёска В.-Кракотка, Слонімскага павету).

Прыехаў (у красавіку) да вучылькі польскі вучыцель з суседняе вёскі—з Сялявіч—Краўчук. Зрабілі нараду, а, ведама, вучыцелька найболей ведае сялян, бо сама паходзіць з нашае вёскі і як іх „trzeba badać". Выбіраюцца сваякі і добрыя знаёмыя, якія пры вочнай стаўцы не пасьмелі-б адмовіцца ад таго, чаго пажадае вучыцелька, і ўдовы, якіх лягчэй запалохаць ці ўгаварыць. Усё зводзіцца да таго, каб зьбіць камплект дзяцей хоць на 39. Тут пачынаецца споведзь, наперад паказваецца нікчэмнасьць беларускае мовы, а калі і гэта не памагае, прыступаюць да пастрашкаў. Былі выпадкі, праўда ў суседняй вёсцы, Мыслава, калі баданьні ад гэтага вучыцеля пераходзілі на пастарушак паліцыі, як да вышэйшай „культурнай" установы.

Але, як відаць, усе хітрыкі не далі магчымасьці зьбіць школьнага камплекту ў Кракотцы. Цяпер ужо ходзяць чуткі—і ўпорныя, што якісь начальнік прыяжджаў аж ад куратара і таксама спраўджаў дэклярацыі (нявядома гдзе) і знайшоў на некаторых дэклярацыях сумліўныя падпісы. Але скуль яны ўзяліся, калі бацькі падпісваліся ў прысутнасьці войта. Як відаць, і тут ня зусім чыстая справа: як ніяк, а ўсё ж трэба было-б паклікаць тых бацькоў, да якіх належаць сумліўныя дэклярацыі.

З сумам трэба зазначыць, што гэтая няпрыгожая барацьба з беларускасьцяй зусім разлажыла В.-Кракоцкую школу, якая перад вайною налічала да 150 дзетак і якая цяпер амаль-што пустуе.

Ня думайце, паночкі, што ў нас ня хопіць цярплівасьці змагацца за школу. З кожным днём сьведамасьць і ўпорства ў нас узмацоўваецца і мы не заспакоімся да таго часу, пакуль не дастанем чыста беларускае школы без усялякіх „утра", а вам барацьбіты проці асьветы ганьба.

Свой.

„Стшэльцы" на вёсцы.

(Вёска Раготная, Слонімскага павету).

Нашую вёску хутчэй можна назваць „Гаротная", чым Раготная, бо хто-ж над ёй не назьдзекуецца? Усякая пошасьць знаходзіць у нас прытулак.

Вось неяк пад нядзелю 24-га чэрвеня г. г. зьявіліся да нас нейкія „стшэльцы" са Слоніма, каб набраць тут у нашай вёсцы для сябе, у сваю арганізацыю сяброў. Заманіваюць нашую несьвядомую моладзь у лавушку то аркестрам, то адзеньнем салдацкім, аружжам, ды гарэлкай. Пасьля іхняй „зьбюркі" была „папойка", дык штосьці страшэннага: сялянская моладзь, якая запісалася ў гэтыя „стшэльцы", была і каля платоў і за платамі..

Дык сьцеражэцеся, браткі, падобных арганізацыяў!

Гаротны.

Культурная праца расьце.

(Дзісьненшчына).

На злосьць ворагам беларускага працоўнага руху, сьведамасьць агартае сэрцы працоўных мас і выліваецца ў творчую працу над адраджэньнем роднай культуры.

Некалькі месяцаў назад, у нас былі такія пэрыяды, што „гэныя" казалі:—„Ну, цяпер у Дзісьненшчыне ўсё памерла"...

Але, як на злосьць „гэным", як наўмысьля, паўстала масавая арганізацыя Т-ва Бел. Школы. Гурткі Т-ва рупна выконваюць сваю працу, сябры павялічваюцца, як грыбы пасьля дажджу. Павялічваюцца сумы ахвяраваных грошай на культурна-асьветныя мэты. Акр. Управа ўсьцяж зьбірае ахвяры на будову бел. гімназіі ў Глыбокім. Усе патрошку складземся і „з „міру" (грамады) па нітцы—голаму кашуля".

Дык дружна, браты!

Я. Няшчасны.

Заварылі кашу—дык хлябайце.

(Вялейшчына).

Хоць зьяўляюся платным падпішчыкам сваёй роднай газэты „Сьцяг Працы", але і „Сялянская Ніва", даведаўшыся нейкім чынам адрас нашай вёскі, ужо болей году бясплатна засыпае яе сваімі газэтамі, каторыя адрасуюцца на імя Жоўткі.

Праўда, чытаць яе ніколі ня прыходзіцца, бо бескарысна: у ёй, апрача маны, нічога ня ўмеюць пісаць, аб чым сьведчаць факты, зьмешчаныя ў № 31 „С. Н." пад загалоўкам „Учадзеўшая Рэдакцыя". Чытаючы гэткія артыкулу, дзе ворагі Беларускага Народу, з нападам на нашую родную змагацельку за лепшыя правы—газэту, выліваюць цэлыя кучы маны, мы пастанавілі паслаць публічнае агалошаньне да рэдактара „С. Н." аб спыненьні нам высыланьня непажаданай газэты, бо яна надаецца толькі на пэўныя рэчы.

Разам заклікаем усіх падпішчыкаў гэтай газэты парваць зносіны з ёю, а грошы перасылаць у „Сьцяг Працы", каторая, як ведама, найляпей бароніць інтарэсы сялян і рабочых.

№ 3560.

Ад Віленскае Беларускае Гімназіі.

На падставе атрыманых распараджэньняў, прыйме ў Гімназію новых вучняў можа адбыцца ўвосені толькі з дазволу Кураторыуму. Усе просьбы адрасуюцца на імя Кураторыуму Віленскага Школьнага Вокругу, але прысылаць іх, разам з дакумэнтамі, трэба ў Дырэкцыю Гімназіі і не пазьней 10 жніўня г. г.

Хто перарос вымаганую норму, той ня можа быць прынятым у Гімназію. У I кл. прыймаюцца ад $9^1/_2$ да 12 гадоў, у II ад $10^1/_2$ да 13 гадоў, у III ад $11^1/_2$ да 14 г. і г. д.

У інтэрнат пры Гімназіі будуць прыймацца толькі хлапцы малодшых клясаў (I—IV кл.) з платаю за ўтрыманьне ад 50 да 60 зл. у месяц, пры сваім адзеньні і бялізьне. (Гэта не адносіцца да стыпэндыятаў).

За падробнымі спраўкамі зварочвацца Канцэлярыю Гімназіі.

Дырэкцыя.

Рэдактар-Выдавец: Ал. Клаўсуць.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.